# Сінагога

*Калнін, В.В. Сінагога / В.В. Калнін // Калнін, В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў: альбом / В.В. Калнін. - Мінск: Кавалер, 2008. - С. 128-133.*



У Гродне захавалася яшчэ адна культавая пабудова, бадай, адзіная падобнага тыпу прыгажосці на Беларусі - мураваная сінагога з пачатку мінулага стагоддзя. Яна знаходзіцца ў раёне Вялікай Траецкай вуліцы, дзе пасяліліся і жылі яўрэі з часоў князя Вітаўта. Архітэктура, набліжаная да стылю мадэрн, насычана мноствам элементаў стылю маўрытанскага, распаўсюджанага ў падобных пабудовах. Асабліва гэта праяўляецца ў інтэр’еры, аздобленым багатай вытанчанай ляпнінай. Да апошняй вайны ў занёманскай частцы была сінагога драўляная, узведзеная яшчэ ў 18-м стагоддзі. Унутры меўся складаны распісны купал, акружаны наверсе вісячай галерэяй. Засталося толькі некалькі фотаздымкаў.

На тэрыторыі Беларусі яўрэйская дыяспара з даўніх часоў канцэнтравалася па гарадах, часам дасягаючы паловы іх жыхароў. Болынасць з яе прадстаўнікоў займалася гандлем і дробным рамяством.

Некаторыя дасягалі значных поспехаў у фінансавай сферы, забяспечвалі крэдытамі заможную шляхту і нават каралеўскі двор. З

дакументаў Вялікага княства Літоўскага вядома, што ў 1528 годзе гарадзенскія яўрэі Харошанькія спаганялі з сыноў заснавальніка Мірскага замка Юрыя Іленіча бацькоўскі доўг “416 з паловай копаў грошаў, 300 бочак салянак жыта, трэсеных з верхам”, акрамя таго, “да звернутых калісьці 250 копаў грошаў дадаць яшчэ 83 капы грошаў і 15 грошаў, 150 бочак жыта”.




У 1862 годзе Ёсіф Шарашэўскі заснаваў тытунёвую фабрыку, якая хутка стала адной з лепшых у Расійскай імперыі. Доўгі час фабрыка была буйнейшым прадпрыемствам горада - на пачатку мінулага стагоддзя на ёй працавала больш за паўтары тысячы чалавек.

У Гродне нарадзіўся Леў Бакст - адзін з заснавальнікаў мастацкага аб’яднання "Мир искусства"; нейкі час у горадзе жыў і працаваў стваральнік мовы эсперанта Людвік Заменгоф; паэт Лейб Найдус перакладаў на яўрэйскую мову класікаў рускай паэзіі А. Пушкіна і М. Лермантава.

Той, хто цікавіцца мінулым Гродна, не можа абмінуць старыя паштоўкі з краявідамі горада і выявамі яго жыхароў. Здымкі рабілі гродзенскія фотамайстры, сярод іх Меер і Лейба Гельгары, Зэльман Карасік, Якаў і Восіп Салавейчыкі, М. Рубінштэйн. На тых здымках можна адшукаць выяву занёманскай драўлянай сінагогі з 18-га стагоддзя, якая была спалена ў апошнюю вайну. Тады ж было знішчана амаль усё яўрэйскае насельніцтва горада.